***А.А. Семяненя***
АУпПРБ (Минск)

# ПОГЛЯДЫ ЯФРЭМА ІВАНАВІЧА КАРНЕЙЧЫКА НА ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ

Я. І. Карнейчык – гісторык-вучоны, аўтарству якога належаць шматлікія навуковыя працы і артыкулы, у тым ліку і “В.І.Ленін і І.В.Сталін - арганізатары Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі”, “Беларускі народ у Айчыннай вайне 1812 г.”, шматтомнік «Гісторыя БССР» 1961 года выдання. Але magnum opus яго даследчай дзейнасці, якое і закранула нашу ўвагу, – кніга “Беларуская нацыя: гістарычны нарыс”. У ёй даследуюцца праблемы фарміравання і развіцця беларускай нацыі, але асаблівую ўвагу аўтар надае гісторыі беларускага нацыянальнага руху, прапануе сваю канцэпцыю беларускай сацыялістычнай нацыі.

Навуковец падкрэслівае, што памылковай з’яўляецца практыка атаясамлення паняццяў "нацыя", "народ" і "этнас". У рэчаіснасці ж этнас і нацыя – феномены, якія адносяцца да розных сацыяльных сфераў. Нацыі ўяўляюць сабой адзін з відаў палітычных рухаў. Яны спалучаюць у сабе як этнічныя, так і сацыяльныя чыннікі. Згодна з марксіцкім вучэннем, фармаванне нацый звязана з узнікненнем спачатку перадумоў капіталізму, а затым і самога капіталізму. Развіццё таварна-грашовых адносін паступова вядзе да кансалідацыі раней адасобленых абласцей ў адзінае гаспадарчае цэлае, што неабходна прыводзіць да палітычнай цэнтралізацыі.

Капіталістычная эканамічная сістэма пачала сваё фармаванне на беларускіх землях падчас іх знаходжання ў Расійскай імперыі. Апісываючы гэту дзяржаву, Я.І. Карнейчык адзначаў, што з цягам часу яна ўсё больш паглыблялася ў крызіс. Існавала патрэба вырашэння не толькі праблемы сацыяльна-эканамічнай несправядлівасці, але і нацыянальнага пытання. Краіна, якая будавала сваю палітыку на вялікадзяржаўных і чарнасоценскіх лозунгах, больш не магла эфектыўна выконваць свае задачы. На гэтай глебе ўзнікала мноства канфліктаў. Адной з праяў народнага змагання з’яўлаецца паўстанне

1863-1864 гг. Гісторык падкрэслівае той факт, што асноўнай мэтай супраціву было "імкненне зліць у адзінае рэчышча рэвалюцыйнай барацьбы супраць царызму і памешчыкаў нацыянальна-вызваленчае паўстанне і антыпрыгонніцкі рух сялянства". Далей вучоны паказвае пераемнасць гэтай ідэйнай парадыгмы сярод прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху на прыкладах пісьменніка Ф. Багушэвіча, часопіса "Гоман" і беларускіх народніцкіх групаў і г.д.

Асноватворчай падзеяй нашай гісторыі Я.І. Карнейчык лічыць Кастрычніцкую рэвалюцыю. Менавіта дзякуючы ёй, некалі бедны і бяспраўны народ перастаў быць аб'ектам гісторыі, а стаў дзеючым творцам гістарычных падзеяў. У беларусаў з'явілася першая дзяржава – Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка. Пачалі ствараца палітычныя інстытуты, з'явіліся вышэйшыя навучальныя ўстановы, ліквідавалася масавая непісьменнасць. Працэс беларускага нацыятварэння было ўжо не спыніць. Аўтар падкрэслівае, што "рэвалюцыя ліквідавала эканамічныя і палітычныя асновы буржуазных нацый і заклала эканамічны і палітычны фундамент фарміравання новых сацыялістычных нацый". Працэс сацыялістычнага нацыягенеза адбываўся на прынцыпах нацыянальнай салідарнасці і справядлівага размеркавання матэрыяльных даброт, то бок менавіта на той палітычнай традыцыі, якую некалі заклаў лідар радыкальнага крыла ў паўстанні 1863-1864 гг. К. Каліноўскі. Адным з найвялікшых дасягненняў рэвалюцыі вучоны бачыць пераадоленне хутарской свядомасці праз калектывізацыю гаспадаркі. Дзякуючы ёй, палепшылася не толькі матэрыяльнае становішча земляробаў, але нарэшце пераўтварыла іх ў "актыўных працаўнікоў грамадскай, калектыўнай вытворчасці". Грамада "тутэйшых" сялян літаральна за дзесяцігоддзе пераўтварылася ў нацыю інжынераў, афіцэраў і вучоных.

Падсумоўваючы, трэба зазначыць, што ва ўмовах пераемнасці Рэспублікі Беларусь ад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, інтэлектуальныя здабыткі і распрацоўкі Я.І. Карнейчыка павінны быць пераасэнсаваны і выкарыстаны у мэтах фармавання зместу ідэалогіі беларускай дзяржавы.